# “КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ”

**незалежны перыядычны *on-line* часопіс**
**у падтрымку беларускай культуры**
**і беларускасьці**

## №14
## Чэрвень 2016

*Часопіс заснаваны ў сьнежні 2012 года*
*Выходзіць раз на тры месяцы*

*Аттава, Канада*

## Дарагія сябры!

Часопіс**"КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ"** заснаваны як незалежнае перыядычнае выданьне, прызначанае для абмеркаваньня праблем беларускай культуры і развіцьця беларускасьці.

Часопіс зьмяшчае арыгінальныя аналітычныя артыкулы, эсэ, а таксама абгрунтаваныя дыскусіі і каментары па гісторыі, мове, літаратуры, сацыялогіі, традыцыях і іншых пытаньнях, маючых дачыненьне да развіцця беларускай нацыі.

Беларуская Мова – асноўная мова часопіса, але магчымы публікацыі і на іншых мовах.

Запрашаем да супрацоўніцтва ўсіх зацікаўленых.

*Свае матэрыялы дасылайце на* chasopis.sakavik@hotmail.com

Часопіс **"КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ"** публікуецца на вэб-старонцы www.sakavik.net



*Аттава, Канада*

*КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ, №14, чэрвень 2016*     *ISSN 2291-4757*

## Зьмест часопіса



*Наступны нумар часопіса выйдзе ў верасьні 2016 года*

*П. Мурзёнак Прадмова да 14-га нумара часопіса "Культура, Нацыя", чэрвень 2016*

У эсэ "Каб жыла беларуская нацыя" разглядаецца развіцьцё беларускай дзяржавы не як краіны, якая знаходзіцца на мяжы паміж Усходам і Захадам, як вызначаў яшчэ І. Абдзіраловіч у 1921 годзе, а як краіны якая пераходзіць ад ваганьня між Усходам і Захадам да больш ўстойлівага стану і выходзіць на асобны шлях развіцьця; абмяркоўваецца роль усходнеславянскай беларуска-украінскай цывілізацыі ў станаўленьні беларускай дзяржаўнасьці, маральныя і этнанацыянальныя праблемы, адмоўныя фактары ўплыву на нацыянальную сьвядомасьць, задачы нацыянальнай эліты ў будаўніцтве этнанацыянальнай, а не цывільнай дзяржавы, нейтральнасьць і еўрапейскасьць Беларусі ў эпоху глабалізацыі.

Працягваецца абмеркаваньне праекта "Стратэгіі развіцьця беларускай нацыі", апублікаванай 6 лютага 2016 года (№12) (зараз падаецца дапоўнены яе варыянт на 25.06.2016). Многія дыскутанты выказваюць нязгоду з уключэньнем у "Стратэгію" палажэньня аб недастковай талерантнасьці беларусаў да асоб нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі, матывуючы гэта тым, што беларускае грамадства не сасьпела да абмеркаваньня гэтай тэмы. Гэта не дзіўна, бо нават сярод нацыянальнай эліты ёсьць людзі, якія, як выдаецца, увогуле не разумеюць нават вызначэньні, што тычацца гэтай катэгорыі людзей. Так, "займацца фемінізмам", на думку некаторых прадстаўнікоў эліты, гэта вельмі прыкра і недастойна.

Рэдакцыя ўдзячна каментарам, дасланым рэдактарам вэб-сайта "Наша зямля" сп. А. Астроўскім. Частка заўваг, зробленая рэдакцыяй "Нашай зямлі", уключана ў дапоўнены варыянт "Стратэгіі" (гэтыя і іншыя зьмены высьветлены колерам). Заслугоўвае абмеркаваньня прапанаваная пашыраная версія "Мэты Стратэгіі": **"**МЭТАЙ Стратэгіі на бліжэйшыя дзесяцігоддзі з'яўляецца пабудова нейтральнай, нацыянальна-дэмакратычнай, беларускай, сьвецкай дзяржавы, у якой на перыяд выпраўленьня гістарычнай несправядлівасьці некалькі апошніх стагоддзяў што да карэннага этнасу (т.б., на час нацыянальнай рэгенерацыі), прадстаўнікі нацыяўтваральнага этнасу – беларусы-літвіны, а таксама іх культура, мова, гістарычная памяць, сімвалы, аўтакефальная царква, сьветагляд, эканамічныя і палітычныя правы, генафонд, іншыя аб'ектыўныя нацыянальныя каштоўнасьці стануць прыярытэтным клопатам для ўсіх грамадзян Беларусі, а найперш для дзяржаўных уладаў".

У раздзеле *"Юбілеі, даты"* зьмешчаны матэрыял, прысвечаны 135-годдзю з дня нараджэння Івана Луцкевіча, выбітнага нацыянальнага дзеяча, аднаго з заснавальнікаў беларускай дзяржавы.

*Эсэ*

**Пётра Мурзёнак: “КАБ ЖЫЛА БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯ”**

Калі запытацца ў беларуса, што для яго азначаюць словы вынесеныя ў загаловак, то адказы будуць неадназначныя. Чалавек сьведамы ў пытаньнях беларускай культуры і гісторыі пачне з сумненьнем задаваць дадатковыя пытаньні: А ці маем мы цяпер сапраўды паўнавартасную беларускую нацыю? Што трэба зрабіць каб яна жыла і разьвівалася? і г.д. Чалавек менш сьведамы ў тэарэтычных праблемах станаўленьня нацый адкажа, – “Аб чым гаворка?! Беларуская нацыя была, ёсьць і будзе”. Безумоўна, што кожная асоба мае рацыю – нават прымаючы да ўвагі магчымыя ўплывы сучаснай глабалізацыі, беларуская нацыя не зьгіне і будзе існаваць праз вякі, як яна рабіла гэта тысячагоддзямі ранейю. Розьніца паміж пазіцыямі гэтых людзей заключаецца ў тым, а ў якой якасьці будзе развівацца беларуская нацыя? Ці здолеюцье беларусы пераадолець тэндэнцыю будаваньня цывільнай рускамоўнай дзяржавы, якая можа ў выніку згубіцца ў сутарэньнях “рускага сьвету” ці глабальнага сусьвету? Ці атрымаецца стварыць каларытную нейтральную беларускую дзяржаву, якая здолее заняць пачэснае месца сярод іншых зямных нацый?

**Ад ваганьня між Усходам і Захадам да больш ўстойлівага стану. Усходнеславянская беларуска-украінская цывілізацыя. Беларусь не на мяжы паміж Усходам і Захадам, а на асобным шляху развіцьця.**

Беларускі этнас быў, ёсьць і будзе ў геапалітычных суадносінах паміж Усходам і Захадам. Шлях беларускага народа вызначаецца як яго гістарычным мінулым, так і унікальнасьцю яго развіцьця, прадыктаванага ўплывамі азіяцкага (праваслаўнага) ўсходу і еўрапейскага (каталіцкага, пратэстанцкага, уніяцкага) захаду. 95 гадоў мінула з таго часу, як малады беларус Ігнат Абдзіраловіч напісаў сваё знакамітае эсэ “Адвечным шляхам”, у якім ён вызначаў Беларусь як мяжу між Усходам і Захадам, як краіну, якой для нацыянальнага развіцьця “трэба шукаць на другіх шляхох”. І. Абдзіраловіч пісаў, што пасьля 10-вяковых ваганьняў беларусы “...не зрабіліся народам Усходу, але не прынялі й культуры Заходняй Еўропы”. І гэта можна прасачыць праз вякі як у маштабах краіны, так і праз асабістую ідэнтыфікацыю на прыкладзе Скарыны “ ... я ня быў ні Юрым, ні Францішкам, а быў вольным, незалежным духам, якога вы шукаеце, духам агульначалавечым толькі ў беларускай скуры. Шукайце ж!” Супрацьстаяньне Ўсходу і Захаду, якое працягвалася так доўга на беларускіх землях, адбываецца і ў наш час, хіба што ў

іншых формах, а для Беларусі гэта адлюстроўваецца ў пошуках набыцьця становішча больш стабільнага і зразумелага. Што ж змянілася за гэтыя вякі?

Зараз многімі прадстаўнікамі беларускай эліты і значнай часткай насельніцтва як аксіёма прымаюцца гістарычныя факты з даўняга мінулага, якія сьведчаць аб тым, што беларускі этнас развіваўся пасьлядоўна ў рамках такіх дзяржаўных утварэньняў як Полацкае княства (IX-XIIIст.), Вялікае княства Літоўскае (XIII-XVI ст.), Рэч Паспалітая (XVI-XVIII ст.), і БССР (XX ст.). XIX-е стагоддзе выпала з гісторыі беларускай дзяржаўнасьці, бо беларусы знаходзіліся ў гэты век пад Расійскай імперыяй. Не ўсё было гладка для беларусаў: Полацкі перыяд і перыяд ВКЛ большасцю прымаюцца ў асноўным як станоўчыя для развіцьця беларускага народа, часы ж знаходжаньня беларусаў, як у складзе Рэчы Паспалітай, так і ў складзе Расійскай імперыі успрымаюцца як перыяды паланізацыі і русіфікацыі, адпаведна. Перыяд русіфікацыі працягваўся для беларусаў у СССР і працягваецца цяпер у незалежнай Беларусі, за выключэньнем кароткіх перыядаў беларускага адраджэньня 20-30-х і 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

Нягледзячы на перыяды уплыву чужых культур, якія ў большасьці прыносілі шкоду развіцьцю беларускай нацыі, беларусы змаглі ўсталяваць у апошнія 100 год незалежнасьць і самастойнасьць. І ў гэтым значная гістарычная заслуга належыць ВКЛ, як аб'яднальніку ўсходнеславянскіх зямель, як дзяржавы здолеўшай зберагчы ўсходнеславянскую беларуска-украінскую цывілізацыю ад паглынаньня еўразійскай цывілізацыяй. І гэта было абумоўлена не ў апошнюю чаргу істотнай этнічнай, ментальнай і гістарычнай розніцай паміж Усходам і самастойнымі народамі Беларусі і Украіны.

Перажыўшы шмат складаных перыядаў, беларусы знаходзяцца цяпер у стане далейшага ўсталяваньня сябе як нацыі і ў вызначэньні шляху, які можа прывесьці іх да новай формы існаваньня ў эпоху сусьветнай глабалізацыі. Калі казаць пра зьнешняе ўспрыняцьце, то суверэнная беларуская дзяржава адбылася і значна ўмацавалася за апошнія чвэрць стагоддзя – яна мае тэрыторыю, свае грошы, войска – амаль усе атрыбуты суверэнітэту. Адказ для тых, хто магчыма запытаецца, чаму яна да гэтага часу яшчэ існуе, нягледзячы на істотныя спробы спаланізаваць і зрусіфікаваць беларускі народ, вельмі просты – таму што беларускі этнас мае глыбокія тысячагадовыя карані свайго развіцьця. Гэта вельмі аптымістычны факт, які не дазваляе сумнявацца ў тым, што сфармаваўшаяся беларуская нацыя будзе і надалей развівацца.

Нядаўна, 9 чэрвеня, на старонках "Нашай Нівы" прачытаў меркаваньне аб тым, што "Расейцы — гэта нашыя суседзі, руская мова — гэта таксама наша мова, як бы

хто ні рабіў выгляд, што яна нам ёсьць чужой. ... Расейцы — культурна не чужыя людзі сучаснаму беларусу. ” Сказана добра ў тым сэнсе, што расейцы і іх мова не чужыя - але ж і не родныя. Расія - блізкая геаграфічна (суседзі), але не блізкая па сваёй ментальнасьці. Мы - не “рускія са знакам якасьці” (А. Лукашэнка), а проста мы розныя, і шляхі ў нас мусяць быць рознымі, а сябраваць трэба з усімі суседзямі. Гэта рознасьць дае падставы народам Беларусі на асобнае існаваньне, без каланіяльнай залежнасьці і прымусу з боку еўразійскай цывілізацыі. Частка ўсходнеславянскай цывілізацыі, Украіна, спрабуе сёньня праз вайну вырвацца з палітычнага, эканамічнага і духоўнага уплыву з боку Расіі. Беларусь, маючы з Украінай вельмі падобны лёс, будзе імкнуцца ці імкнецца абараніцца ад паглынаньня “рускім мірам” і не мае іншага выйсьця як шукаць свой шлях.

Здаецца, як ва ўладных структурах, так і сярод беларускага насельніцтва, з’яўляецца ўсё больш прыхільнікаў развіцьця Беларусі па свайму асобнаму шляху. Аб гэтым сьведчыць і палітыка ўлады, спрабуючай размеркаваць палітычныя і эканамічныя высілкі паміж Расіяй і астатнім сьветам, так і шматлікія апытаньні сярод беларускіх грамадзян аб магчымых перавагах далучэньня да Расіі ці да Еўрапейскага Саюза. Падаецца, што ў гэтым сэнсе беларускае грамадства падзелена пароўну. Хаця лічбы вагаюцца ў залежнасьці ад знешніх ці ўнутраных фактараў, аднак, можна казаць, што каля 30-40% людзей глядзяць на Ўсход, столькі ж на Захад, і, як заўжды, ёсьць частка людзей нейтральных.

Калі казаць пра агульную тэндэнцыю за апошнія чвэрць стагоддзя, то думаецца, што колькасьць прыхільнікаў асобнага шляху і інтэграцыі з Еўропай расьце. А лепей сказаць, гэта тэндэнцыя праглядаецца ў справе далучэньня беларускага грамадства да глабальных працэсаў развіцьця чалавечай супольнасьці, якое адбываецца праз інфармацыйныя патокі і новыя тэхналогіі, да якіх беларусы мусяць паспець далучыцца. Спазненьне можа быць катастрафічным і прамарудзіць – гэта значыць адпіхнуць краіну ў другую ці трэцюю паўсотню краін сусьвету, хаця Беларусь магла б па свайму патэнцыялу займаць месца сярод першых дзесяткаў краін. Але ж, у цэлым беларускае грамадства не крытычна адхілілася ад агульнасусвутнага кірунку развіцьця.

Справа не ў тым быць нам ці не быць у Еўрасаюзе ці у Еўразійскім Саюзе. Хочам мы гэтага ці не, а сусьвет пачынае развівацца па новых, глабалізацыйных правілах. Супрацоўніцтва паміж краінамі ў свеце зараз у значнай ступені падпарадкоўваецца, часам на шкоду дэмакратычным каштоўнасьцям, прынцыпам рэальнай палітыкі – галоўнае каб яно прыносіла эканамічную карысьць грамадству. Калі зменяцца гэтыя “практычныя” прынцыпы невядома, аднак, іх трэба ўлічваць.

Эканамічная і палітычная сітуацыя ў Беларусі зараз вельмі складаная і гэтая складанасць толькі часткова абумоўлена сусьветным крызісам. Адносная задаволенасьць насельніцтва існуючымі парадкамі можа тлумачыцца толькі цярплівасьцю беларусаў. Яны могуць пражыць на пенсію ў 3 млн ці на зарплату ў 6 млн рублёў (сярэдняя па краіне ў маі 2016 г. складала каля 300 даляраў), пры тым, што 1 кг свініны каштуе каля 100.000 рублей, 1 л малака каля 12.000 рублей, камунальныя паслугі для 2-х комнатнай кватэры каля 800.000 руб на месяц. Гэта лепш у параўнаньні з беднымі краінамі сьвету, але значна горш чым у суседніх еўрапейскіх краінах. Пэўна прызвычаіліся да гэтага з часоў СССР, калі былі моманты і хлеб, і водка былі па талонах.

Тыя спадзеўкі, што ўскладваліся на ЕАЭС, пакуль не спраўджваюцца. Расія не дапускае Беларусь да радовішчаў газу і нафты на сібірскіх прасторах, не працуюць законы свабоднай эканамічнай зоны. На паседжаньні кіраўніцтва ЕАЭС 30 мая 2016 года ў Астане быццам бы і былі прынятыя важныя дакументы аб агульнай прасторы для гандлю нафты і газа без дадатковых мытных пабораў. Аднак, паводле адкрытай інфармацыі, такія правілы пачнуць дзейнічаць толькі з 2025 года. Гэта адназначна сведчыць аб тым, што Расія адцягвае прыняцьце такіх механізмаў эканамічнага суіснаваньня з адной мэтай – да 2025 года вырашыць пытаньні “інтэграцыі” іншымі шляхамі. Такім чынам, кіруючая ўлада ў Беларусі вымушана шукаць шляхі выратаваньня сёньня на заходніх рынках і рынках краін трэцяга свету. Што яна і робіць з пераменным посьпехам.

Аднак, думаецца што многія з беларусаў хацелі б увайсьці ў новыя умовы існаваньня чалавецтва паўнавартаснай нацыянальнай дзяржавай. Задача суперскладаная. Не хочацца верыць, што нацыі зямлян будуць развівацца ў фармаце халодная вайна – гарачая вайна. Чалавецтва вымушана шукаць новыя прынцыпы існаваньня нацый і народаў паміж несумяшчальнымі з нейкага пункту гледжаньня рэчамі – паміж дэмакратыяй і дыктатурай, здаровым нацыяналізмам і праявамі фашызма, парадкам і анархіяй, ідэямі гуманізма і рознымі неталерантнымі рэлігійнымі ідэямі.

Даўнішняя гісторыя Беларусі цесна звязана з Польшчай, Украінай, Літвой і Латвіяй, з якімі ў нас сёньня няма сур’ёзных супярэчнасьцяў. Бліжэйшая ж пагроза для Беларусі, як думаецца, ідзе з Расіі, і не як краіны з вялізным ваенным, эканамічным і палітычным патэнцыялам, а як краіны якая нясе ідэалогію еўразізма, ідэалогію верхавенства дзяржавы над асобай, калектывісцкага менталітэту над індывідуальным, павагі да моцных аўтарытарных лідэраў. Гэта моцна адрознівае Расію ад Беларусі, якая падчас доўгай гісторыі набыла шмат прыкмет заходняй цывілізацыі. Яшчэ адзін бадай самы небяспечны фактар для беларускай нацыі

заключаецца ў тым, што Расія, валодаючы шматграннай культурнай спадчынай і сучаснай культурай і карыстаючы рускую мову як інструмент, можа паглынаць культуры малых краін, уключна з краінамі пост-савецкай прасторы. Усё гэта разам падштурхоўвае Беларусь шукаць, абгрунтоўваць і абараняць свой спецыфічны шлях для зберажэньня і развіцьця нацыянальнай дзяржавы.

**Маральныя і этнанацыянальныя праблемы ў Беларусі. Знешнія і ўнутраныя адмоўныя фактары уплыву на нацыянальную сьвядомасьць**

У наш час пагроза для беларускай нацыі наўрад ці ляжыць у сферы ваеннай, эканамічнай ці палітычнай. Малаверагодна чакаць нападу ад краін-суседзяў, нават, калі адкінуць магчымасьць паўтарэньня гібрыднага тыпу расійскай агрэсіі (“зялёныя чалавечкі”), якую мы назіраем зараз на Украіне. Так думаецца таму, што вядучыя заходнія краіны здолелі ўсё ж з дапамогай санкцый стрымаць агрэсара. Такім чынам, відавочна, лёс беларускай нацыі будзе ў першую чаргу залежыць ад фактараў, якія па свайму характару з’яўляюцца ідэалагічнымі, культурнымі. Гэтыя фактары можна падзяліць на знешнія і ўнутраныя.

На жаль, знешняя пагроза нацыянальным інтарэсам Беларусі ёсьць і ідзе яна не з Захаду, а як і раней з Усходу. Стратэгічная задача для беларускай нацыі гэта выскачыць з пад-уплыву і абдымкаў еўразійскай Расіі і як мінімум дабіцца нейтральнага існаваньня беларускай дзяржавы ў асяроддзі еўрапейскіх краін. Калі ў Расіі не адбудзецца адкат ад імперскага мышленьня і ідэі ўзнаўленьня былой гегемоніі ў сьвеце, то яна, як пераемніца духоўнай спадчыны Расійскай імперыі і СССР, пацягне Беларусь на дно як “Цітанік”.

Імкненьне беларускага народа да свабоды і незалежнасьці знаходзяцца пад атакай ідэй аб адзінстве трох усходнеславянскіх народаў; на дапамогу прыходзіць несастарэлая, прыхаваная савецка-камуністычная ідэалогія, а таксама гераічнае змаганьне народаў СССР супраць фашысцкай агрэсіі падчас II-й сусьветнай вайны. Ёсьць шмат фактаў, якія сьведчаць аб тым, што ідэалагічная вайна супраць беларускага нацыяналізму з боку Расіі вядзецца даўно, і на жаль, міжволі ці нават пры магчымай падтрымцы з боку беларускай улады. Прыгадаем толькі нядаўнія факты:

- журналісты “Нашай Нівы” паказалі, што беларускія дзеці з Віцебскага рэгіёна накіроўваюцца ў ваеньна-патрыятычныя лагеры Расіі, дзе яны “выхоўваюцца” пад кіраўніцтвам людзей з нацыстскімі паглядамі;

- сп. Гіркін, чалавек, які ўзначальваў захоп г. Славянска падчас вайны ў Данбасе, заяўляе аб стварэньні арганізацыі, якая мірным шляхам будзе імкнуцца да аб’яднаньня Беларусі і Украіны з Расіяй;

- расійская прапаганда праз тэлебачаньне і радыё безальтэрнатыўна замбіруе насельніцтва Беларусі адносна сваіх дзеяньняў (“Крым - наш”, фашысты-нацыяналісты-бандэраўцы кіруюць у Кіеве, і г.д.);

- толькі за апошнія тры тыдні (май-чэрвень 2016 г.) Беларусь наведалі высокія госьці з Расіі – С. Нарышкін, спікер Дзярждумы Расіі (10.06.2016; 50-я сэсія Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі: “Наше взаимодействие представляет бесценный опыт, является живым примером как для евразийской экономической интеграции, так и для других новых международных площадок”), У. Пуцін (8.06.2016; абмеркаваньне ўзгодненай палітыкі ў Саюзнай дзяржаве), В. Матвіенка (8.06.2016; з ідэяй адзінай візы для Саюзнай дзяржавы), С. Лаўроў (16.05.2016; аб сумесным супрацьстаяньні пашырэньню НАТО на ўсход);

- расійскія цэнтры навукі і культуры адкрыты ў Мінску і ў Брэсьце, хутка будзе адкрыты ў Гомелі, а затым у астатніх абласных цэнтрах;

- ваенны ўціск - жаданьне адкрыць ваенную базу ў Баранавічах, размяшчэньне ў чэрвені расійскай брыгады у Клінцах, блізу граніц з Беларуссю і Украінай;

- эканамічны ўціск – на форум рэгіёнаў у пачатку чэрвеня ў Мінск прыехалі прадстаўнікі больш чым 40 расійскіх суб’ектаў (абласьцей), на якім вырашаліся ў асноўным сацыяльна-эканамічныя пытаньні (стварэньне агульнага з Расіяй інфармацыйнага цэнтра аб працоўных месцах, прызнаньне пост-дыпломнай адукацыі, абмен студэнтамі на вучобу). Тут трэба заўважыць, што ў ельцынскія часы, калі Лукашэнка разыгрываў расійскую карту, ён шмат ездзіў па Расіі - зараз жа сітуацыя зьмянілася на процілеглую.

Няцяжка ўявіць, які ўплыў могуць аказваць прыведзеныя прыклады на размываньне беларускай сьвядомасьці. Дадайце сюды сьвежыя хатнія прыклады. Сёняшняе кіраўніцтва выкарыстоўвае набыткі савецкай прапаганды для рэалізацыі праваленых камуністычных прынцыпаў і маралі: у школы прыходзяць даведзеныя планы аб колькасьці акцябрат у класе, каля 10 на 25 вучняў (І. Халіп, “Хартыя 97”), піянеры ў чырвона-зялёных формах прыбіраюць лісты каля помніка Марата Казею, галоўны ідэолаг краіны залівае бетон на Ленінскім суботніку, ордэн Дружбы народаў уручаны лідэру камуністаў Расіі сп. Зюганаву, ордэн Ф. Скарыны расійскаму кампазітару В. Дробышу. Улада эксплуатуе нават дату нападу Германіі на СССР у 1941 годзе – 22 чэрвеня 2016 года пачаў працу Ўсебеларускі народны

сход. Беларуская вёска зьнішчана, беларуская эліта загнаная ў гета, не развіваецца нацыянальная адукацыя (няма ні аднаго нацыянальнага універсітэта, колькасьць беларускіх школ і садкоў - мізэрная), прыцясьняецца нацыянальна-сьведамая інтэлігенцыя (звальненьне з працы, прымус працаваць на псеўданацыянальную ідэалогію), нераўнапраўна ўжываецца дзяржаўная беларуская мова. І самае галоўнае – беларускаму народу фактычна адмоўлена ў праве будаваць нацыянальную дзяржаву, замест яе ўзмацняецца рускамоўная цывільная дзяржава. Побач з Мінскам пабудавана “лінія Сталіна”. Ад каго абараняемся?!

Хтосьці можа сказаць, а што было кепскага ў савецкіх часах і ў камуністычнай маралі? Тады, пры “апошніх саветах”, была стабільнасьць, сацыяльная абароненасьць, чаго не назіраецца зараз у многіх пост-савецкіх краінах. Ды і шмат ёсьць прыкладаў стабільных доўгажывучых аўтарытарных рэжымаў, заснаваных на падобных прынцыпах (В’етнам, Кітай, Куба, Паўночная Карэя), дзе да гэтага часу аднадушна-аднагалосна ўслаўляюць наследных камуністычных лідэраў. Калі браць пад увагу штодзённыя клопаты (праблему “жывата”), то якраз тут улада, як і ў савецкія часы, у большай ці ў меншай ступені (але ж усё меней ды меней) як бы задавальняе патрэбы насельніцтва (беларусы ж жылі і ў шмат горшых умовах?!).

Але ў пытаньнях развіцьця нацыі аўтарытарны рэжым проста здраджвае свайму народу. Беларусь не мае ў поўнай меры уласьцівых для другіх нацыянальных краін прыкметаў, якія б сьведчылі аб наяўнасьці беларускай нацыі. Для многіх краін пытаньні аб развіцьці роднай мовы, культуры і традыцый не стаяць і не могуць стаяць на парадку дня – такія пытаньні натуральныя і адказ на іх не патрабуе асаблівых высілкаў. У роднай жа Беларусі нацыянальныя пытаньні – дзякуючы антынацыянальнаму ураду – да гэтага часу не вырашаныя. Зусім па-дурному, улада не хоча займацца ўласным народам, для якой ён уяўляецца насельніцтвам з яго настальгіяй па савецкіх часах і варожым стаўленьнем да нацыянальных пытаньняў\нацыяналістаў, і да такіх заходніх каштоўнасьцяў як дэмакратыя і правы чалавека.

Больш за 60 год прайшло ад напісаньня Чэславам Мілашам эсэ “Зьняволены розум” (1953). Эсэ, зьвернутае да аналізу маральнага існаваньня нацыянальнай эліты ва ўмовах дыктатуры і сёньня не губляе сваёй актуальнасьці. На шчасьце, многія пытаньні нацыянальнай сьвядомасьці і свабоды асобы у яго роднай краіне, а таксама ў краінах былога сацыялістычнага лагера, на даным этапе вырашаны. Чаго нельга сказаць пра амаль усе рэспублікі Савецкага Саюза, якія так і не здолелі выбрацца, з аднаго боку, з рабства камуністычнай ідэалогіі, а з другога, з рабства савецка-расійскай імперыі. Калі б Чэслаў Мілаш зараз пабачыў Беларусь, то

магчыма не здзівіўся б існуючымі парадкамі, бо сам пражыў амаль у 40-гадовым чаканьні вясны, аб якой марыў і якую прысьпешваў.

Крытыцы камунізма і антынацыянальнай палітыкі ў пост-савецкіх краінах прысьвечаны шматлікія публікацыі, уключна з Беларусьсю (А. Астапенка, З. Пазьняк, С. Шарэцкі, С. Шушкевіч). Паводле розных тэарэтычных даследаваньняў відавочна, што камунізм і нацыяналізм – дзве несумяшчальныя ідэалогіі. Абяцаючы на пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі светлыя ідэі роўнасьці, свабоды і брацтва, дыктатуры пралетарыята, самавызначэньня нацый, кіраўніцтва кампартыі СССР збочыла на курс партыйнай дыктатуры, інтэрнацыяналізму і перасьледу нацыянальна-дэмакратычных памкненьняў шматлікіх народаў, якія ўваходзілі ў склад вялікай краіны. На жаль, астравок былога СССР з яго ідэалогіяй застаўся ў Беларусі за выняткам невялікіх выключэньняў.

Нацыя, з'яўляючыся найвышэйшай катэгорыяй у будаўніцтве дзяржавы, набыла ў выкананьні сучаснага кіраўніцтва незразумелыя формы. З аднаго боку, яно, кіраўніцтва, карыстаецца перавагамі атрыманага ў спадчыну даволі высокага якаснага стану беларускага грамадства для забеспячэньня сацыяльнай роўнасьці і справядлівасьці ў рэспубліцы, што безумоўна не можа не падтрымлівацца насельніцтвам (у параўнаньні з іншымі рэспублікамі былога СССР гэта было абумоўлена ў цэлым высокай адукацыяй насельніцтва, адносна лепшым развіцьцём тэхналогій, не страчаным ад савецкіх часоў "вертыкальным" кіраўніцтвам). Аднак, з другога боку, уся грамадская ідэалагічная надстройка застаецца ў многім савецкай, якая даказала сваю нядзейнасьць і прывяла да краху не толькі СССР, а да "глабальнага" краху сацыялістычнага лагера.

У цэлым можна адзначыць, што шэраг як знешніх, так і ўнутраных маральных і ідэалагічных фактараў пакуль што з'яўляюцца неспрыяльнымі для будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы, а самой краіне без вырашэньня нацыянальных пытаньняў можа нават пагражаць страта суверэнітэту.

**Этнанацыянальная дзяржава супраць цывільнай дзяржавы. Неабходнасьць стварэньня нацыянальнай элітай агульных канкрэтных праграм**

Змена курсу краіны з сёнешняга будаўніцтва рускамоўнай цывільнай дзяржавы на будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы можа адбыцца праз зьмену цяперашняй улады ці яе поглядаў на пытаньні развіцьця нацыі. Але у любым выпадку павінна прысутнічаць асьвета насельніцтва і фарміраваньне нацыянальнай сьвядомасьці.

Можна меркаваць, што сярод сучаснага кіраўніцтва ёсьць думаючыя людзі, якія разумеюць, што існуючая дзяржаўная мадэль не будзе жыцьцяздольнай, аднак, малаверагодна, што такія людзі змогуць істотна ўплываць на погляды кансерватыўнага і антынацыянальнага па сутнасьці лідэра краіны. У той жа час у Беларусі зараз няма ўмоў для зьмены ўлады дэмакратычным шляхам. Тэхнічна саму працэдуру выбараў нават заходнія назіральнікі не могуць аб’явіць недэмакратычнай, бо ацэньваючы яе па мерках сваіх краін, не могуць уявіць як працуе прыручаная выбарчая сістэма на самой справе. Таму, падаецца, што вырашэньне нацыянальных пытаньняў мусіць адбывацца разам са змаганьнем за стварэньне умоў для правядзеньня справядлівых, празрыстых і дэмакратычных выбараў у дзяржаўныя інстытуты усіх узроўняў.

Відавочна, што ўмовы, створаныя ўрадам, не задавальняюць жаданьняў нацыянальнай эліты, якая якраз і мусіць прапагандаваць і прапанаваць свайму народу асобны шлях ў глабальным сусьвеце – без нацыянальнага твару беларуская дзяржава наўрад ці здолее ўтрымацца ў шэрагах іншых нацый, якія існуюць на зямлі. Дык ці прапануе беларуская эліта вырашэньне нацыянальных пытаньняў дэмакратычным шляхам, праз правядзеньне сваіх кандыдатаў у парламент падчас выбараў? Бо падаецца, што удзельнічаць трэба, нават пры адсутнасьці умоў для нармальных выбараў, і толькі для таго каб данесьці да насельніцтва альтэрнатыўныя праграмы, уключна з праграмамі нацыянальнага будаўніцтва.

Аднак тут, яшчэ не дайшоўшы да самога працэса выбараў, трапляем у заганнае кола - умоў для правядзеньня змен праз дэмакратычныя выбары няма – сіл у беларускай апазіцыйнай эліты для дэмакратычных зьмен недастаткова – не ўсе сябры магчымай кааліцыі маюць нацыянальныя праграмы. Як вынік, час для будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы неспрыяльны і Беларусь працягвае заставацца цывільнай рускамоўнай дзяржавай.

Сапраўды, умоў для дэмакратычных выбараў да гэтага часу няма – на працягу апошніх 4 выбараў у парламент у выбарчых камісіях амаль адсутнічалі прадстаўнікі апазіцыйных сіл, падлік галасоў быў непразрыстым (не ў сэнсе адсутнасьці шкляных урн). Ды і інтэнсіўнага і агульнага змаганьня за зьмены ў выбарчае права праз Канстытуцыйны суд Беларусі, ААН, АБСЕ, камісіі па правах чалавека, і г.д. амаль не было заўважна. Было б лагічным дамагацца ў першую чаргу стварэньня нармальных дэмакратычных умоў існаваньня партый і грамадскіх арганізацый па канкрэтнай агульнай праграме. І тут якраз многія беларускія лідэры, заклікаючы да аб’яднаньня, маюць рацыю. Галоўным тут было б дасягненьне ўмоў для свабодных выбараў. Падаецца, што зараз не час для міжпартыйнай барацьбы

беларускіх партый, а сама такая барацьба дае незразумелыя для звычайнага выбаршчыка вынікі.

У гэтым годзе беларуская палітычная эліта зноў спрабавала фармальна аб'яднацца перад чарговымі парламенцкімі выбарамі. Прычым гэтыя высілкі ў асноўным былі скіраваны на арганізацыйныя пытаньні, з кім, калі, і як, хаця заклікі аб'яднноўвацца раней не спрацоўвалі, ці не давалі жаданых вынікаў; не аднойчы падпісываліся мемарандумы (Вільня, 2012), амаль перад кожнымі выбарамі зьбіраліся кангрэсы дэмакратычных сіл (і перад кожнымі выбарамі гэта рабілася нанова). Але такое яднаньнне не павіньна было б быць дзеля самаго яднаньня і вылучэньня адзіных кандыдатаў пад не зусім выразнымі лозунгамі. Не спрацавалі яны і на гэты раз. Некаторыя фармальныя пагадненьні можна ўспрыймаць толькі як заявы пра палітычныя намеры, а не як канкрэтныя планы дзеяньня. І зноў апазіцыйныя сілы ідуць рознымі калонамі: правыя (Рух "За свабоду", БХД, АГП), кампанія "Гавары праўду", камуністы і яшчэ адны камуністы, ЛДПБ, Усебеларускі кангрэс за незалежнасьць. Такі падыход, які быў бы апраўданы ў дэмакратычных краінах, відавочна, абумоўлены як амбіцыямі лідэраў, так і магчымай розьніцай у праграмных устаноўках партый і грамадскіх рухаў – аднак, гэта ў значнай ступені распыляе нешматлікія нацыянальныя сілы. Шанец патрапіць у парламент хаця б некалькім дэпутатам ад апазіцыі абсалютна нізкі.

Да таго ж, нацыянальныя пытаньні стаяць у праграмах толькі некалькіх партый, БНФ, КХП-БНФ, ... і на гэтым амаль усё. Такіх пытаньняў няма ў праграмах ліберальных партый - Аб'яднанай грамадзянскай партыі і Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Відавочна, што такіх праграм няма сярод дыванных партый кшталту Беларускай спартыўнай партыі. Можна думаць і ў будучай прэзідэнцкай партыі "Белая Русь" (Грамадзкая арганізацыя "Белая Русь" яшчэ не ўступала на арэну як палітычная сіла, але яна магчыма выйдзе як толькі апазіцыйныя партыі хоць нейкім чынам здолеюць набраць моцы і будуць уяўляць адну сапраўдную, а не разрозненную сілу).

Роль партый у беларускім грамадстве нязначная, што абумоўлена рознымі прычынамі: іх запраграмаванай фракцыйнасьцю (што было б нармальна у дэмакратычнай краіне), абсалютна недастковым інфармаваньнем насельніцтва аб іх працы, да якіх дадаецца аўтарытарны характар дзяржаўнага кіраваньня і дзяржаўная прапаганда, якія абмяжоўваюць дзейнасьць партый (адзіная пост-савецкая ідэалогія, падпаракаваныя дзяржаве СМІ, зарэгуляваныя ўмовы існаваньня незалежных СМІ). Аднак, што падаецца найбольш важным, беларуская эліта не мае канкрэтных агульных праграм развіцьця краіны, уключаючы нацыянальныя пытаньні, якія былі б альтэрнатыўнымі праграмам дзейнага ураду і

маглі бы стаць прывабнымі для насельніцтва Беларусі. Гэтыя разрозьненыя партыйныя праграмы\планы, як бы само сабой разумеюцца – новы выбарчы закон, дэмакратыя, правы чалавека, мільён працоўных месцаў. Аднак, гэтыя "уяўныя праграмы" плятуцца ззаду за галавой калон (а не адной калоны), якія накіроўваюцца на "барыкады". Здавалася б, павіньна быць наадварот - выпрацоўка больш менш агульнай праграмы на сёняшнім этапе (напрыклад, змаганьне за стварэньне ўмоў для свабодных, дэмакратычных выбараў) - спрыяла б маналітнасьці калоны і дазволіла б ёй дайсьці да сваёй мэты не рассыпаўшыся на фрагменты па дарозе. Лагічна было б думаць, што такая праца павінна распачынацца не перад, а пасьля выбараў і працягвацца на пастаяннай аснове.

А што ж самі беларусы? – А яны як і раней церпяць, і так атрымоўваецца, што зусім не час ды й няма каму думаць пра нацыянальную ідэнтыфікацыю ці пра развіцьцё нацыі ў цэлым. Гэта калі казаць пра асноўную масу людзей, якая і ў лепшыя часы аб гэтым моцна не задумваецца, за выключэньням аднясеньня сябе да нацыі беларусаў. Пакуль што на пытаньне аб нацыянальнасьці "беларус" становўча адклікаецца 83.7% грамадзян Беларусі нягледзячы на сваю ў большасьці рускамоўнасьць, што паводле Ч. Мілаша можна было б называць нацыянальным кетманам, калі б гэта было праўдай. Пытаньні развіцьця нацыі застаюцца выключна пытаньнямі для нацыянальнай эліты.

Нацыянальная эліта мае шмат яскравых і таленавітых людзей. Пры адсутнасьці неабходнай еднасьці трэба было б хаця б падтрымліваць і спрабаваць зразумець тых людзей, хто нешта і канкрэтна робіць у краіне. Аднак, прыкладаў яднаньня нацыянальнай эліты ў выкананьні агульных праектаў няшмат (ТБМ, "Летучий университет", "Мова нанова"). Пры адсутнасьці беларускага нацыянальнага універсітэта спробы аб'яднаць сілы ў яго стварэньні канчаліся пакуль што нічым. Адны жадаюць і не могуць, а другія могуць, але не жадаюць быць з тымі, што не могуць. І гэта не толькі на полі ўтварэньня нацыянальнага універсітэта. Тое ж назіраецца і ў палітычных, калі так можна казаць, баталіях, дзе робяцца спробы дзяліць тое чаго няма пры адсутнасьці жаданьня нават тактычнага яднаньня.

Незалежныя СМІ з'яўляюцца амаль адзіным дзейным інструментам у руках нацыянальнай эліты, каб правесьці неабходныя ў краіне зьмены. Усё ж, артыкулаў, прысьвечаных агульным праблемам нацыянальнага развіцьця і іх абмеркаваньню, сустрэнеш не так і шмат. Такія выданьні як "Хартыя 97" ці "Радыё Свабода", заняўшы сваю нішу, адлюстроўваюць філасофію ці ідэалогію ў асноўным толькі вузкай катэгорыі людзей, якія стаяць за іх спіной.

*КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ, №14, чэрвень 2016 ISSN 2291-4757*

Пытаньне трэба ставіць востра – ці здольная нацыянальная эліта праводзіць хаця б адносна блізкую ідэалогію\палітыку ў нацыянальных пытаньнях ці ў ажыцьцяўленні сумесных канкрэтных праграм (напрыклад, стварэнне нацыянальнага універсітэта)? Без вырашэньня нацыянальных пытаньняў змаганьне толькі за дэмакратычныя ці іншыя ліберальныя каштоўнасьці на нашу думку недастаткова для зьмены свядомасьці беларускіх людзей. Якія б шырокія плыні ні адлюстроўвалі незалежныя СМІ, ліберальныя, сацыяльна-дэмакратычныя, ці нават спартыўныя (і яны, вядома ж, павінны існаваць паасобку і мець свой напрамак), аднак, без разуменьня еднасьці ў падыходах да нацыянальнай асьветы насельніцтва чакаць добрых вынікаў у збудаваньні незалежнай беларускай дзяржавы не даводзіцца.

Такім чынам, нацыянальная эліта знаходзіцца ў складаных умовах, якія характарызуюцца неабходнасьцю адначаснага вырашэньня нацыянальных і дэмакратычных праблем. Выйсьці з заганнага кола будзе магчыма пры ўмацаваньні нацыянальных сіл і іх еднасьці ў выкананьні агульнай стратэгіі па выхаваньню нацыянальнай свядомасьці сярод насельніцтва Беларусі.

**Беларусь: нейтральнасьць - па форме і зместу, еўрапейскасьць і беларускасьць – па духу. Нейтральнасьць і глабалізацыя**

Якім шляхам будзе развівацца Беларусь у глабальным сусьвеце прадказваць вельмі складана. Аднаго б не хацелася: каб Беларусь, спрабуючы вырвацца з пад еўразійскага ўплыву, праходзіла такі ж шлях, які робіць Украіна. Украіна, наша адзіная радня па ўсходнеславянскай цывілізацыі, за сваё імкненьне жыць у свабоднай Еўропе падверглася прамой ваеннай агрэсіі з боку Расіі і “пакарана” адняцьцем Крыму і акупацыяй Данбасу. Мала ў каго павернецца язык сказаць, каб Беларусь брала ў рукі зброю каб абараніць свой нацыянальны гонар. Тое што адбываецца паміж Украінай і Расіяй гэта анахранізм, абсалютны выхад Расіі за цывілізацыйныя рамкі. Захад, здаецца, праснуўся і магчыма, што санкцыі прынятыя супраць агрэсара, абароняць не толькі Украіну, але і Беларусь і іншыя краіны-суседзі, патэнцыйныя ахвяры ўзнаўляемай расійскай імперскай палітыкі. Таму пагроза адносна нацыянальнай бяспекі па-ранейшаму застаецца з усходу, а не з захаду.

Значная частка нацыянальнай эліты змагаецца пад лозунгамі “Беларусь у Еўропу!”. Заклікі да ўступленьня ў Еўрасаюз – гэта добра. Магчыма, калі Еўрасаюз вырашыць праблемы паміж Украінай і Расіяй, то ён можа зьвярнуць увагу і на

беларускія праблемы. Аднак, калі гэтыя праблемы не будуць вырашаць самі беларусы, то ніякі Еўрасаюз ці другія дарадцы нам не дапамогуць. Усё вызначаецца ўнутраным жыцьцём нацыі, яе духам. Няхай краіна невялікая па колькасьці насельніцтва - але з гонарам, няхай няма каштоўных выкапняў - але ёсьць цудоўныя працавітыя людзі, прыгожыя прасторныя лясы і шырокія багатыя палі. І тут найбольш важным павінна стаць паступовае ўсведамленьне беларусаў, што яны жывуць у незалежнай і суверэннай еўрапейскай краіне.

Ці гатова Беларусь да ўступленьня ў Еўрасаюз і ці рада гэтаму будзе Еўропа? Тэарэтычна так. Пытаньне толькі - калі? Паводле Т. Снайдэра, гэта можа адбыцца не раней як у 2040-2050 гг. З такім прагнозам можна пагадзіцца, калі ўлічваць як настроі ў беларускім грамадстве, так і тыя зьмены, якія зараз назіраюцца ў еўрапейскіх краінах. Мы ўжо нагадвалі аб тым, што беларусы не аддаюць яўнай перавагі усходняму, заходняму ці нейтральнаму (асобны шлях) вектарам у развіцьці краіны – на працягу апошніх гадоў лічбы раўнамерна вагаюцца паміж трыма напрамкамі ў залежнасьці ад многіх часовых фактараў. Аднак, можна заўважыць паступовую тэндэнцыю пашырэньня прыхільнікаў асобнага шляху. У апытаньні праведзеным Беларускім інстытутам стратэгічных даследаваньняў (BISS, 2015) прыхільнікаў незалежнай Беларусі па-за ўсякімі саюзамі было ў 2010 г. – 20.4%, у 2011г. – 29.3%, у 2013 г. – 30.9%, у 2015 г. – 31.1%. Хацелася б, каб назіраемая тэндэнцыя не была памылкай апытаньняў.

Магчыма, што частка беларусаў прытрымліваецца ідэі свайго асобнага шляху для краіны менавіта памятаючы адмоўныя ўплывы паланізацыі і русіфікацыі на станаўленьне беларускай нацыі. Беларусы памятаюць перыяд паланізацыі, асабліва ў XVII-XVIII стст. Аднак, да канца XVIII-га стагоддзя мы жылі ў Еўропе пакуль нас не паглынула еўразійская цывілізацыя. Таму еўрапейская культура нам генетычна больш зразумелая і блізкая у параўнаньні з расійскай культурай, якая паступова выціскае з беларусаў нацыянальную свядомасьць у наш час праз рускамоўную сістэму дзяржаўнай адукацыі. Іншымі матывамі для асобнага шляху могуць быць пагрозы паглынаньня Беларусі Расіяй (ваенныя, эканамічныя, культуральныя), а таксама няўстойлівы стан як у Расіі, выкліканы эканамічным сусветным крызісам, так і ў ЕС, у сувязі з міграцыйнымі працэсамі і тэрарызмам.

Трэба таксама ўлічваць неагрэсіўную ментальнасьць беларусаў – наўрад ці хто можа ўявіць, каб беларусы кінуліся біць англійскіх фанатаў з крыкамі “Беларусы, вперёд!”, калі б адбываўся матч паміж футбольнымі камандамі Беларусі і Англіі.

У нейкім сэнсе “нейтральныя” настроі падтрымліваюцца і цяперашняй уладай – ва ўсялякім выпадку, нядаўна кіраўніком дзяржавы было заяўлена аб дасягненьні ў

2020 г. рознанапраўленасьці гандлю і развіцьця эканомікі ў прыблізна роўных прапорцыях з Расіяй, развітымі краінамі і краінамі трэцяга сьвету.

Не адмаўляючы сваёй гістарычнай, культурнай, ментальнай прыналежнасьці да Еўропы, мы прапагандуем нейтральнае развіцьцё беларускай нацыі. Гэта не адмаўляе еўрапейскасьці беларускай нацыі і з цягам часу можа адпавядаць думкам і настроям большай часткі грамадства і адказваць на выклікі глабальнага свету. Нейтральнасьць дазволіць Беларусі выйсьці з пад блокавага мысленьня, пад якім яна зараз знаходзіцца ў звязку з Расіяй (Саюзны дагавор з шэрагам вайсковых абавязкаў, Арганізацыя дзяржаў калектыўнай бясьпекі), а з другога - не будзе вымагаць далучэньня да іншых ваенных блокаў (НАТО). Думаецца, што гэта будзе адпавядаць і будучым выклікам, якія стаяць перад чалавецтвам – барацьба з тэрарызмам ці з незаконнай міграцыяй, дзе Беларусь змагла б ўдзельнічаць не як сябра лакальных мілітарных утварэньняў, а як сябра міжнароднай супольнасьці ў цэлым.

З другога боку, шлях у ЕС - вельмі складаны. Еўрасаюз пачаў стварацца ў 1950 г., аднак працэсы кансалідацыі гэтага супердзяржаўнага, наднацыянальнага ўтварэньня яшчэ не скончыліся. ЕС зараз мае шэраг сваіх унутраных праблем, якія патрабуюць свайго вырашэньня, напрыклад, праблемы, зьвязаныя з выхадам Брытаніі з ЕС, ці ўступленьня Турцыі ў ЕС, массавая незаконная міграцыя ў Еўропу з Афрыкі і Азіі, пытаньні з шэнгенскімі візамі, тэрарызм. Беларусь, маючы адчыненую мяжу з Расію, ня можа нават марыць аб непасрэдным еўрапейскім шляху. Вельмі блізкія праблемы мае і Украіна. Хоць яна і ўступіла на шлях далучэньня да заходніх інстытутаў (ЕС, НАТО), аднак, відвочна, што ён не будзе кароткім нават пры актыўнай пазіцыі палітычнай эліты Украіны. Што ж казаць пра Беларусь, якая ўсё больш вязьне ў эканамічных і мілітарных абдымках Расіі?

Такім чынам, падаецца, што нейтральнасьць-еўрапейскасьць мусіць быць у цэнтры беларускага асобнага шляху. Нейтральнасьць Беларусі адмаўляе прыналежнасьць да лакальных ваенных ці іншых саюзаў і ў той жа час адчыняе дзверы для кааперацыі і добрых адносінаў з цывілізаванымі краінамі. Некаторыя спробы абгрунтоўваць існаваньне Беларусі ў рамках наддзяржаўных аб'яднаньняў ва ўмовах сучаснай глабалізацыі (інтэграцыя інтэграцый, Беларусь у цэнтры славянскага саюза, канцэпт Севера і Северной Евразии) маюць кан'юнктурны, часовы і, зноў жа, рэгіянальны характар і не адлюстроўваюць у поўнай меры настроі і патрэбы беларускай нацыі.

Не выглядае, што развіцьцё нацый ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі ва ўмовах сучаснай глабалізацыі будзе спынена, запаволена, ці прыме нейкія новыя формы. Чалавек, як

істота біялагічная, заўжды будзе імкнуцца быць на радзіме ці па крайне меры аб ёй марыць, а як істота сацыяльная шукаць іншых людзей, якія падзяляюць з ім каштоўнасьці культурныя, гістарычныя і нацыянальныя. Падаецца, што нават у ЕС, які ўяўляе сабой найбольш развітую наддзяржаўную структуру, роль нацый не будзе памяншацца. Тыя наступствы, якія вынікаюць з незаконнай міграцыі, сьведкамі якой мы зараз з'ўляемся, наўрад ці зьменяць істотна этнанацыянальны склад еўрапейкіх краін.

Думаецца, што міграцыйныя патокі не закрануць значна і Беларусь. Па разліках *Pew Research Center* у Беларусі ў 2050 годзе 2.4% насельніцтва будзе вызнаваць іслам (у 2010 г. – 0.2%), пры тым што доля рэлігійных і нерэлігійных хрысьціян будзе складаць 97.4% (у 2010 г. – 99.6%). Відавочна, што невялікая доля мусульман не зможа істотна зьмяніць нацыянальную свядомасьць беларусаў. Шмат большы адмоўны уплыў на развіцьцё беларускай нацыі будзе аказваць невысокая нараджальнасьць дзяцей. Па прагнозах таго ж агенцтва колькасьць насельніцтва Беларусі за перыяд з 2010 па 2050 гг. зьменшыцца на 11.4% (з 9.6 млн да 8.5 млн чалавек) нават пры тым, што беларусы ў параўнаньні з жыхарамі суседніх краін маюць найменшыя памкненьні да эміграцыі ("Культура, Нацыя", 2014, №6).

Хацелася б спадзявацца, што развіцьцё беларускай нацыі ў глабальным сусьвеце будзе адбывацца ў стане нейтральнасьці пры зьберажэньні і ўзбагачэньні беларускай культуры і традыцый.

**Piotra Murzionak: To Live Belarusian Nation**

*(Abstract, magazine "CULTURE, NATION", June 2016, issue 14, pp. 5-21)*

The sovereign Belarusian state held and significantly strengthened over the past quarter of a century. However, the Belarusian statehood is threatened by Russia as not as a country with a huge military, economic and political potential, but as the country carrying Eurasism ideology, the ideology of the state preference and collectivist mentality over the individual, respect for strong authoritarian leaders. Another dangerous Russian factor for the Belarusian nation is that Russia, having a multi-faceted cultural heritage and contemporary culture and using the Russian language as a tool, can absorb the culture of small countries, including the post - Soviet space countries.

There are plenty of recent evidence that the ideological, imperial war against the Belarusian nationalism on the part of Russia carried out for a long time, and unfortunately, neglected or even with possible support by the Belarusian authorities. Unfortunately, an island of the former USSR with its ideology remained in Belarus where national issues are still not resolved.

All this encourages Belarusians to look, justify and defend its own specific way for the preservation and development of the nation-state. This way is based on the differences between Russia and Belarus - Belarus in the course of the long history has gained a lot of signs of Western civilization. In addition, there is a significant ethnic, mental and historical difference between the East and the people of not a borderland between East and West, but independent peoples of Belarus and Ukraine, which together constitute the East Slavic Belarusian-Ukrainian civilization. Ukraine is now trying to escape through the war from political, economic and spiritual influence on the part of Russia. Belarus, having with Ukraine a very similar fate, will seek to protect itself from absorption by "Russian world" and has no choice but to look his own way.

However, if these problems will not be solved themselves by Belarusians, no European Union or the United States will help. Everything is determined by the inner life of the nation, its spirit. Without denying its historic, cultural, and mental belonging to Europe, we advocate a neutral development of the Belarus, therefore, it appears neutrality-Europeanness must be at the center of the Belarusian specific way. Neutrality allows Belarus to get out of a "block" thinking by which she is now forced to be together with Russia (Union Treaty with a number of military duties, the Organization of States of Collective Security), and on the other hand it will not require a connection to other

military alliances (NATO). Neutrality does not deny Europeanness of Belarusian nation and over time may correspond to the thoughts and sentiments of the majority of society and to meet the challenges of the global world.

National elite is in a complex environment characterized by the need to address national and democratic issues simultaneously. Get out of the vicious circle will be possible with the strengthening of national forces and their unity in the performance of the overall strategy for the education of national consciousness among the population of Belarus. It is hoped that the development of the Belarusian nation in the global universe will be able in neutral environment while preserving and enriching the Belarusian culture and traditions.

*КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ,* №14, *чэрвень 2016* ISSN 2291-4757

*Дыскусія “Нацыянальнае будаўніцтва і сучаснасць - 2015”(працяг)*

**Тэма: “СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ”**

***Дапоўнены праект «СТРАТЭГІІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ» (па стану на 25 чэрвеня 2016 года)***

*“Стратэгія развіцьця беларускай нацыі” упершыню апублікавана на старонках часопіса “КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ” 6 лютага 2016 года.*

*Калі ласка, свае каментары і заўвагі дасылайце на адрас: chasopis.sakavik@hotmail.com*

## *Стан беларускай нацыі*

За мінулае стагоддзе беларусы дасягнулі значнага прагрэсу ў будаўніцтве сваёй дзяржавы – у свеце стала існаваць незалежная і суверэнная краіна Беларусь, прынятая ў ААН. У развіцці краіны за гэты час былі спрыяльныя і неспрыяльныя перыяды, а сучасныя дзяржаўнасць і суверэнітэт Рэспублікі Беларусь значна ўмацаваліся толькі пасля выхаду з СССР. Аднак, трэба адзначыць шэраг фактараў, якія не спрыяюць будаўніцтву нацыянальнай дзяржавы, а менавіта, прыхільнасць сучаснага кіраўніцтва да пабудовы рускамоўнай, цывільнай дзяржавы, зберажэнне савецкага, аўтарытарнага стылю кіравання краінай, выхаванне патрыятызму, заснаванагаму толькі на кароткачасовай гісторыі апошняй вайны, прыгнёт беларускай мовы і беларускасці, удзел у ваенных блоках (АДКБ, асобныя дамовы з Расіяй), усё большае уключэнне краіны ў сферу "русского мира", ідэалогія якога скіравана на ваенную, палітычную і культурную экспансію не толькі на суседнія, але і на далёкія краіны, дзе ёсць прыкметы рускай мовы і культуры.

Цяперашняя дзяржаўная палітыка знаходзіцца ў супярэчнасці з рэалізацыяй нацыянальнай ідэі, аб чым сведчаць неўжыванне роднай мовы ў дзяржаўных установах, савецкая інтэрпрэтацыя гісторыі Беларусі, увядзенне ў вучэбных установах дысцыпліны «Ідэалогія беларускай дзяржавы», якая не асвятляе вырашэнне нацыянальных пытанняў, выцясненне нацыянальна свядомых

беларусаў са школ і ўніверсітэтаў, беларускіх выканаўцаў і аўтараў з дзяржаўных тэле- і радыёканалаў, існаванне чорных спісаў музыкаў, пісьменнікаў, прадстаўнікоў іншых творчых прафесій, забарона ўжывання нацыянальных сімвалаў. Некаторыя праявы беларускасці з боку дзяржавы (рэдкія выступы кіраўнікоў па-беларуску, з’яўленне беларускіх білбордаў) не маюць сістэмнага характару і хутчэй выглядаюць рэхам лавіравання ў дзейснай геапалітычнай сітуацыі. Найноўшая мадыфікацыя патрыятызму, якая пераважна грунтуецца на дасягненнях савецкай эпохі і факце перамогі ў Другой сусветнай вайне, не можа лічыцца прадуктыўнай і перспектыўнай, бо перакрэслівае ўсю папярэднюю 1000-гадовую гісторыю станаўлення беларускай дзяржаўнасці, што пачынаецца з часоў Полацкага і Турава-Пінскага княстваў.У той жа час трэба адзначыць, што без чыннага ўдзелу самой дзяржавы нацыянальнае будаўніцтва сіламі толькі нацыянальнай эліты будзе ў значнай ступені запаволена.

Сярод шэрагу мадэляў будаўніцтва дзяржавы (грамадзянская/цывільная, культурная, уяўная) выбар мадэлі этнанацыянальнай дзяржавы ў найбольшай ступені адпавядае рэальнай сітуацыі ў Беларусі. Будаўніцтва цывільнай нацыі без належнага грунту этнакультурнай еднасці, падмацаванай агульнай гісторыяй, традыцыямі, мовай, светапоглядамі і, так ці іначай, этнічным паходжаннем, – з’яўляецца памылковым шляхам. Ніштo ў сучасных умовах не можа так спрыяць будаўніцтву дзяржавы як прыналежнасць большасці грамадзян да аднаго этнасу (83.7% насельніцтва краіны адчуваюць сябе беларусамі, 2009). Нельга пагадзіцца з тым, што Беларусь многанацыянальная краіна. Большасць нацыі складаюць беларусы (нацыўтваральны этнас, тытульная нацыя), якія ў асноўным і вызначаюць менталітэт краіны, яе агульны настрой і адносіны да знешняга свету.

У той жа час у Беларусі нацыянальныя меншасці жывуць у бяспецы, дзякуючы як існуючым цывільным рэгулам, так і міралюбівым адносінам да нацыянальных меншасцяў саміх беларусаў. Будучая этнанацыянальная дзяржава ўяўляецца такой дзяржавай, якая рэальна адстойвае інтарэсы тытульнай нацыі і ў якой грамадзянам меншасцяў гарантуюцца роўныя правы і абарона ад асіміляцыі пры рэалізацыі іх нацыянальных праектаў. Толькі на гэтым шляху бачыцца будучыня нашай краіны. Беларусь не можа будаваць дзяржаву на аснове культурнай мадэлі ці цывільнай рускамоўнай мадэлі, як гэта робіцца цяпер, па адной простай прычыне. І ў адным, і ў другім выпадку паглынанне беларускай дзяржавы "русским миром", з’яўляецца непазбежным.

Мяркуецца, што далейшае існаванне беларускай дзяржавы мусіць набыць фармат нейтральнасці. На сёння ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь запісана, што “Рэспубліка Беларусь ставіць за мэту зрабіць сваю тэрыторыю без’ядзернай зонай,

а дзяржаву — нейтральнай" (Артыкул 18). Стан нейтральнасці будзе палітычным выхадам з-пад пагрозы быць уцягнутымі ў сферу "рускага свету" і адпавядае як ментальнасці беларускага народа, так і дзяржаўным інтарэсам. Відавочна, што стан нейтральнасці не прадугледжвае сяброўства ў ваенных ці іншых блоках, уцягнутых у рэгіянальныя ці глабальныя канфлікты. Стан нейтральнасці дае прававыя і маральныя падставы супрацьстаяць ваеннай ці эканамічнай агрэсіі, якія паграджаюць незалежнасці і суверэнітэту краіны. Правы і абавязкі нейтральнай дзяржавы вызначаны ў раздзелах 5 [1] і 13 [2] Гаагскай канвенцыі ад 1907 года. Набыццё краінай юрыдычнага статусу нейтральнасці ў нашы дні можа быць прызнана ААН. Нейтральнымі краінамі ў Еўропе на сёння з'яўляюцца: Аўстрыя, Ірландыя, Ліхтэнштэйн, Мальта, Малдова (з 1994), Сан-Марына, Сербія (з 2007), Фінляндыя, Швейцарыя, Швецыя (хаця некаторыя з гэтых краін ёсць сябрамі Еўрапейскага Саюза, ЕС). Пры гэтым важна таксама ўсведамляць, што ні шчыльная сувязь з Еўрасаюзам, ні – тым больш – з Расіяй не будуць аптымальнымі варыянтамі далейшага развіцця.

Падаецца, што будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы не можа быць заснавана выключна на хрысціянскай маралі, па некалькіх прычынах, многаканфесійнасці ў краіне, адсутнасці абсалютнай перавагі (больш 50%) якой-небудзь рэлігійнай канфесіі, наяўнасці значнай долі атэістаў сярод насельніцтва (41%). Нам трэба будаваць свецкую (не рэлігійную) нацыянальную дзяржаву, у якой будзе забяспечана свабода ўсіх веравызнанняў, калі іх дзейнасць не супярэчыць заканадаўству РБ.

Стан самаідэнтыфікацыі беларускай нацыі па-ранейшаму застаецца недастакова трывалым. Прычынамі для гэтага з'яўляюцца як савецкая спадчына, так і працяг сучасным кіраўніцтвам амаль той жа палітыкі ў дачыненні да нацыянальных пытанняў. Грамадзяне Беларусі да гэтага часу не разглядаюць незалежнасць краіны, як адну з найважнейшых каштоўнасцяў. Але ў той жа час, калі казаць пра аднясенне сябе да беларускай нацыі, то 83.7% насельніцтва краіны называюць сябе беларусамі (перапіс 2009 года). Такая высокая нацыянальная аднароднасць выглядае добрым грунтам для будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы.

Сітуацыя з роднай мовай вельмі балючая і катастрафічная, што сталася вынікам як аб'ектыўных працэсаў, звязаных з урбанізацыяй, так і з бяздзейнасцю і наўмыснай этнацыднай палітыкі цяперашняга ўрада, што фактычна вядзе да паступовага выцяснення мовы з нацыянальнай свядомасці. Адзначаючы, што пераважная большасць грамадзян Беларусі прыхільна ставіцца да беларускай мовы і культуры, усё ж ва ўмовах заняпаду беларускай мовы спадзявацца на дастойнае і поўнае будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы можна толькі пры дапушчэнні, што беларусы

будуць глыбока ведаць сваю даўнішнюю гісторыю (Полацкае княства, ВКЛ), узровень ведаў пра якую яшчэ недастатковы.

Магчымасці станаўлення і развіцця грамадзянскай супольнасці, заснаванай на дэмакратычных каштоўнасцях, ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму вельмі абмежаваныя. Пад уплывам Расіі і Расійскай праваслаўнай царквы ў апошнія 2 стагоддзі ментальнасць беларускага насельніцтва фармавалася на карысць інтарэсаў царскай улады Расійскай імперыі, а потым у інтарэсах камуністычнай дыктатуры СССР - пасіўнасці, моцнай дзяржаўнай улады, і не была скіравана на развіццё асобы, яе свабоды і павагі да прыватнай уласнасці. Усё гэта разам з сучаснай дзяржаўнай прапагандай прывяло да таго, што палітычная культура беларусаў і ўзровень развіцця грамадзянскай супольнасці застаюцца ўсё яшчэ на неапраўдана нізкім узроўні. Відавочна, што людзі не ўспрымаюць аўтарытарны рэжым, як пагрозу дэмакратычным свабодам, што магчыма звязана як з асобай кіраўніка дзяржавы і з той палітыкай якую ён праводзіць, з эканамічнай і палітычнай стабільнасцю, якая на гэты час іх задавальняе, так і з антыканстытуцыйным ціскам на свабоду слова і татальным падпарадкаваннем СМІ дзяржаве. Парадаксальна, але грамадзяне Беларусі, падтрымліваючы ў большасці дэмакратыю (75.3%), у той жа час не супраць аўтарытарнага стылю кіравання (61.6%). На рэферэндуме 1996-га году 65% грамадзян прагаласавалі за тое, што дзяржава не павінна даваць справаздачу грамадскасці за фінансаванне ўсіх галін улады. Толькі дэзарыентаванае, збітае з тропу прапагандай насельніцтва магло прагаласаваць такім чынам. Спадзявацца ж на сапраўднае паўнавартаснае супрацоўніцтва з аўтарытарнай дзяржавай не выпадае ў сілу таго, што сучаснае кіраўніцтва не разглядае грамадства ў якасці раўнапраўнага партнёра.

Ментальнасць беларусаў недасткова падрыхтаваная да ўспрыймання каштоўнасцей, звязаных з роўнасцю людзей, якія ў цывілізаваным свеце паступова ўваходзяць у жыццё і з разуменнем успрымаюцца грамадствам, у прыватнасці, беларусы недастаткова талерантныя ў адносінах да іншых расаў, ~~нетрадыцыйных рэлігій і да асоб нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі~~, адмоўна ставяцца да адмены смяротнага пакарання.

Нацыянальная свядомасць саміх грамадзян Беларусі пакуль што вельмі слабая. Такія прыметы як некарыстанне роднай мовай, нежаданне весці дзяцей у беларускія школы і садкі, нізкая актыўнасць у пратэстных акцыях, абыякавасць да нацыянальных каштоўнасцяў, настальгія па савецкасці, успрыманне рускай культуры як сваёй, а ўспрыманне сваёй культуры як другаснай, знівеліраванае пачуццё нацыянальнага гонару ніяк нельга залічыць у актыў нацыянальнай свядомасці. Да таго ж “русский мир” непазбежна атачае нас штодня. На вывучэнні

твораў менавіта рускіх пісьменнікаў грунтуюцца каштоўнасныя арыентацыі навучэнцаў сярэдніх школ; п'есы рускіх драматургаў пераважаюць у айчынных тэатрах; расійская папса гнятуча дамінуе на большасці канцэртных пляцовак Беларусі і ў медыясферы. Відавочна, што беларускае грамадства не зможа пазбавіцца са сваіх посткаланіяльных поглядаў да таго часу, пакуль не пераадолее рэфлекс бясконцага азірання на Расію. Не спрыяе росту нацыянальнай свядомасці і пастаянна прапагандуемая і не адпавядаючая гістарычным фактам ідэя аб трыадзінстве усходнеславянскіх народаў, што асабліва стала відавочна падчас ваеннай агрэсіі Расіі супраць Украіны.

Будаўніцтва паўнавартаснай нацыянальнай дзяржавы пры недахопе якасцяў аб якіх ішла размова вышэй будзе запаволена, нягледзячы на тое, што па сваёй адукаванасці і нават па ўзроўню жыцця Беларусь магла б адпавядаць еўрапейскім стандартам. Будаўніцтва нацый-дзяржаў у Еўропе працягваецца ў такіх этнічна аднародных краінах як Сербія (83% насельніцтва складаюць сербы), Харватыя (88%), Славенія (89%), Літва (84%). Беларусь мае патэнцыял будаваць нацыянальную дзяржаву таксама.

Беларуская нацыянальная эліта імкнецца выкарыстоўваць каштоўнасці, заснаваныя на глыбокай гісторыі, адвечнай культуры і традыцыях беларускага народа. Сучаснае дзяржаўнае чынавенства і нацыянальная эліта, як высвятляецца з публічных прамоваў, збіраюцца будаваць розныя мадэлі Беларусі, якія, паводле логікі, слаба сумяшчальныя паміж сабой. Аднак, у грамадстве няма свабоднага абмену думкамі, адкрытага поля для змагання ідэй. Грамадзяне краіны за свае погляды і незалежную пазіцыю загнаны ў палітычную і культурную рэзервацыю, запісаны ў творчыя чорныя спісы.

Прапануемая Стратэгія развіцця беларускай нацыі разлічана на бліжэйшыя два дзесяцігоддзі ў незалежнасці ад магчымых змен унутранага ці знешняга палітычнага\геапалітычнага характару (рэвалюцыя, агрэсія ці іншае). Не адмаўляючы і падтрымліваючы палітычныя падыходы, трэба заўважыць, што пастаяннай задачай нацыянальных сіл мусіць быць змаганне за нацыянальную свядомасць грамадзян Беларусі, а такая праца патрабуе доўгага часу і не можа быць вырашана кароткачасовымі кампаніямі.

Сілы нацыянальнай эліты за апошні час значна пашырыліся за кошт шматлікіх інстытутаў, арганізацый і вэб-структур, аднак, на жаль, значная колькасць іх вымушана дзейнічаць з-за мяжы. Свабодна ж працаваць на радзіме вельмі складана з-за шматлікіх абмежаванняў і прынятых законаў, якія фактычна загналі свабодную думку разам з мовай тытульнай нацыі ў "беларускае гета". У дадатак, трэба

адзначыць, што сёньняшнія апазіцыйныя СМІ – радыё “Свабода”, газеты “Наша Ніва”, “Народная воля”, спадарожнікавы тэлеканал “Белсат” – за столькі гадоў працы так і ня сталі сапраўды незалежнымі беларускімі СМІ і вельмі часта адлюстроўваць інтарэсы толькі асобных груп людзей.

Нягледзячы на пэўныя слабасці «няспелай» беларускай нацыі магчымасць будаўніцтва поўнавартаснай нацыі і нейтральнай, беларускай нацыянальнай дзяржавы застаецца. Гэта надзея базуецца на: незалежнасці і суверэнітэце, якую зараз мае РБ, высокай нацыянальнай аднароднасці насельніцтва (83.7% беларусы), наяўнасці нязначнай па колькасці, але актыўна працуючай нацыянальнай эліты, істотнай долі насельніцтва, якая спачувае ці можа падтрымаць ідэі, скіраваныя на ўмацаванне нацыі, узрастаючай колькасці інфармацыйных рэсурсаў, спрыяльных знешніх умовах, тэарэтычных доказах магчымасці будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы ў пост-мадэрны перыяд, у часы існавання інфармацыйнага грамадства.

## *Мэта Стратэгіі*

Мэтай прапаноўваемай Стратэгіі з'яўляецца пабудова нейтральнай, нацыянальнай дзяржавы,у якой абсалютна роўныя правы будуць мець прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў і прадстаўнікі нацыяўтваральнага этнаса - беларусы.

## *Задачы, якія вынікаюць з характарыстыкі сучаснага стану беларускай нацыі і пастаўленай мэты:*

Распаўсюджваць ідэю аб атрыманні краінай нейтральнага стану праз правядзенне рэферэндума і замацаванні гэтага палажэння ў Канстытуцыі РБ.

Падтрымліваць і прапагандаваць, абапіраючыся на гістарычныя факты, ідэю аб этнічнай гістарычнай унікальнасці беларускай народа, развіццё якога істотна адрозніваецца ад развіцця народаў Расіі. Лічыць ідэю аб трыадзінстве усходнеславянскіх народаў (Беларусі, Расіі, Украіны) не адпавядаючай гістарычнай праўдзе і шкоднай.

Падтрымліваць ідэю пераемнасці ў гістарычным развіцці беларускай дзяржаўнасці. Дабівацца сусветнага прызнання выключнай ці роўнай ролі беларускага народа ў развіцці Вялікага Княства Літоўскага - вялікай еўрапейскай дзяржавы мінулага, на тэрыторыі якой сёння пражываюць людзі сучасных незалежных краін, Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны. Першыя княствы на тэрыторыі Беларусі, Вялікае Княства Літоўскае, станаўленне і здабыццё незалежнасці Рэспублікі Беларусь, - усе гэтыя перыяды з’яўляюцца састаўнымі часткамі нашай нацыянальнай гісторыі.

Выцісканне і прыніжэнне любога гістарычнага перыяда не адпавядае інтарэсам нацыі.

Для папярэджання пагрозы страты незалежнасці і суверэнітэту РБ праз ваенныя, эканамічныя ці культурныя механізмы супрацьстаяць ідэалогіі “русского мира” і н’юеўразізма, якія ўяўляюць сабой абноўленыя формы імперскага шавінізму.

Не падтрымліваць сучасны ўрад у будаўніцтве цывільнай, рускамоўнай дзяржавы, і адначасова працягваць пошук актыўнага ўзаемадзеяння з мясцовымі ўладамі ў рамках законаў, рабіць гэта індывідуальна і арганізаванымі групамі грамадзян для паляпшэння сітуацыі ў адносінах да мовы (садкі, класы, школы, дакументацыя), гісторыі (назвы вуліц, памятныя знакі) і па іншых пытаннях.

На сучасным этапе праводзіць асветніцкую дзейнасць сярод насельніцтва ў першую чаргу ў галіне гісторыі, элітарнай і мас-культуры і традыцый беларускага народа (Полацкая дзяржава, ВКЛ, БНР, БССР, адраджэнне 90-х), не збаўляючы высілкаў па вызваленні беларускай мовы з прыгнечанага стану. Дабівацца раўнапраўнага, непрымусовага ўжывання беларускай мовы ў дзяржаве, стварэння нарматыўнай базы на мове тытульнай нацыі.

Ва ўмовах сфальшаванага двухмоўя і невыканання “Закона аб мовах” стымуляваць выкарыстанне Мовы ва ўсіх сферах грамадскага і культурнага жыцця, ужываючы ўсе магчымыя падыходы і сродкі, прадстаўленыя ў “Стратэгіі развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі” (2012), уключаючы: адкрыццё беларускіх нацыянальных універсітэтаў, якіх павінна быць не менш паловы з усіх існуючых у краіне, заахвочванне грамадзян Беларусі аддаваць дзяцей у беларускія садкі і школы, мовазнаўчую і інфармацыйную падтрымку беларускай рэкламы прадуктаў і тавараў, заахвочванне рэлігійных абшчын розных канфесій да правядзення багаслужбы на беларускай мове і грамадскіх арганізацый нацыянальных меншасцяў да вывучэння беларускай мовы і гісторыі, заахвочванне грамадзян Беларусі і адпаведных рытуальных агенцтваў ужываць беларускую мову на надмагільных надпісах.

Для асветы насельніцтва стварыць агульны нацыянальны інфармацыйны канал і шэраг інфармацыйных пляцовак (газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне), пабудаваных па прынцыпу грамадскіх СМІ, на якія не змогуць ўплываць і ціснуць ідэалагічныя структуры аўтарытарнага рэжыму.

Даводзіць (грамадству) інфармацыю пра ўсе станоўчыя праяўленні беларускасці і рэагаваць на ўсе без выключэння праявы этнацыду беларусаў. Шанаваць і развіваць гонар за дасягненні, якія мае беларускі народ сёння.

Папулярызаваць нацыянальных дзеячаў, зрабіўшых найбольшы ўклад у развіццё нацыі: І. Насовіч, Н. Орда, В. Дунін-Марцінкевіч, С. Манюшка, К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч, Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, Б. Эпімах-Шыпіла, І. Луцкевіч, Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, У. Галубок, В. Ластоўскі, Я. Лёсік, А. Луцкевіч, М. Багдановіч, А. Чарвякоў, Б. Тарашкевіч, Р. Шырма, Г. Цітовіч, Л. Геніюш, М. Ермаловіч, В. Быкаў, А. Адамовіч, У. Караткевіч, М. Крукоўскі, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, У. Мулявін.

Адзначаць нацыянальныя святы, якія пакуль што не значацца ў афіцыйным календары: 25 сакавіка – Дзень Волі, першае абвяшчэнне незалежнасці краіны, Беларускай Народнай Рэспублікі; 15 ліпеня – Грунвальдская бітва; 27 ліпеня – Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь; 8 верасня – Дзень беларускай вайсковай славы, 27 лістапада – Слуцкі збройны чын.

## *Падыходы і сродкі рэалізацыі*

1. У сваіх адносінах паміж людзьмі, якія будуць падтрымліваць рэалізацыю Стратэгіі пажадана выконваць наступныя правілы “Кодэкса гонару”: лічыць, што ўдзел у будаўніцтве нацыянальнай дзяржавы гэта вялікі гонар для беларусаў і прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў; праяўляць узаемапавагу і падтрымку; крытычна і абгрунтавана вясці спрэчкі, не допускаючы пры гэтым абраз і спасылак на неправераныя факты; быць талерантнымі да выказванняў апанентаў; максімальна ўжываць беларускую мову дома і па-за домам; прытрымлівацца адзіных падыходаў пры выкананні задач Стратэгіі; пазбягаць фракцыйнасці - пабудаваць нацыянальную дзяржаву можна толькі праз адзінства людзей, незалежна ад таго, прыхільнікамі якіх партый, рухаў, рэлігійных і іншых плыняў яны з’яўляюцца.

2. Давесці змест Стратэгіі да максімальнай колькасці грамадзян РБ. Пажадана каб тэкст Стратэгіі мела кожная сям’я. Адказнасць за выкананне гэтай задачы бяруць на сябе часопіс «Культура, Нацыя», Таварыства беларускай мовы з далейшым далучэннем нацыянальна-арыентаваных вэб-сайтаў і іншых СМІ.

3. Рэалізацыя Стратэгіі разлічана на бліжэйшыя два дзесяцігоддзі ў незалежнасці ад магчымых змен унутранага ці знешняга характару (рэвалюцыя, агрэсія ці іншае).

4. Мець на ўвазе, што для рэалізацыі Стратэгіі больш важным з’яўляецца выхаванне і падтрымка адпаведнага нацыянальна-свядомага настрою ў грамадстве ў доўгатэрміновай перспектыве, чым нават наяўнасць ці адсутнасць матэрыяльных магчымасцяў.

5. Паступовае пашырэнне кола нацыянальна свядомых грамадзян РБ праз асвету і правядзенне пастаянных і рэгулярных акцый, скіраванных на выкананне пастаўленых задач, з удзелам адбудаванай адкрытай грамадзянскай супольнасці як унутры краіны, так і за яе межамі.

6. Для вырашэння задач стратэгіі, ва ўмовах абмежаванага доступу да СМІ і адсутнасці дапамогі з боку дзяржавы, выкарыстоўваць усе наяўныя і шукаць новыя сілы і сродкі беларускага грамадства, прыхільных да нацыянальнай ідэі грамадзян РБ, спонсараў, інтэрнэт-рэсурсы, незалежныя і дзяржаўныя СМІ.

7. Шукаць магчымасці лабіравання нацыянальных інтарэсаў шляхам народнай дыпламатыі і праз спробы наладжвання дыялогу з тымі супрацоўнікамі праўладных структур і колаў, якія падзяляюць акрэсленую сістэму каштоўнасцяў.

*У распрацоўцы праекта прымалі ўдзел: Алена Анісім, Аляксандр Кашо, Пётра Мурзёнак, Алег Трусаў, Ірына Шумская.*

**Заўвагі рэдакцыі «Нашай зямлі» (рэдактар сп. Алесь Астроўскі) на версію «Стратэгіі развіцця беларускай нацыі” ад 25 сакавіка 2016 года**

У цэлым мы несумненна падтрымліваем і аптымістычна-змагарны настрой, і галоўны пасыл данай “Стратэгіі”. Асабліва падтрымліваем пазіцыю (гэта вынікае з кантэксту), што **этнічная беларуская нацыя** – зь яе культурай, мовай, гісторыяй, сімваламі (а таксама нейтральным, бязьядзерным, сьвецкім статусам яе дзяржавы) – зьяўляецца адной з найвялікшых каштоўнасьцяў людскай цывілізацыі, якую неабходна захаваць. Тым больш гэта ўсё – і беларуская дзяржава, і нацыя – неабходна самім беларусам-літвінам.

Тым ня менш, у нас ёсьць і некалькі заўваг.

1. Гісторыя беларускага народу на яго ўласнай этнічнай тэрыторыі налічвае не 1000 гадоў, а **некалькі тысячагоддзяў**.

2. У лукашэнкаўскай Беларусі адбываецца ня толькі ***“выцясьненьне беларускіх выканаўцаў і аўтараў зь дзяржаўных тэле- і радыёканалаў”***, сёньня выкідаюцца нацыянальна сьвядомыя беларусы таксама і **са школ ды ўніверсітэтаў** (пры гэтым не зьвяртаецца ўвага ні на іх афіцыйны статус, ні на рэальныя дасягненьні) – галоўнае, што яны “сьвядомыя”.

3. Сітуацыя з роднай Мовай стала катастрафічнай не па прычыне “бязьдзейнасьці” цяперскага ўраду, а па прычыне яго **наўмыснай этнацыднай палітыкі** (напрыклад, з 40 тэлевізійных каналаў, якія можна глядзець у Гародні па кабельным тэлебачньні, няма ні воднага беларускамоўнага…).

4. У праекце запісана: ***“Для асветы насельніцтва стварыць агульны нацыянальны інфармацыйны канал і шэраг інфармацыйных пляцовак (газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне), пабудаваных па прынцыпу грамадскіх СМІ, на якія не змогуць ўплываць і ціснуць ідэалагічныя структуры аўтарытарнага рэжыму”.*** Але пры гэтым не прааналізавана, чаму сёньняшнія апазіцыйныя СМІ – радыё “Свабода”, газеты “Наша Ніва”, “Народная воля”, спадарожнікавы тэлеканал “Белсат” – за столькі гадоў працы так і **ня сталі** сапраўды незалежнымі беларускімі СМІ. Без аналізу гэтай зьявы і адпаведных высноў, зробленых зь яе, дзейнасьць у кірунку стварэньня будучага “нацыянальнага інфармацыйнага каналу”, нават, калі на яго нехта (хто?!) дасьць грошы, ня мае персьпектывы.

5. Беларусізацыя ніколі не адбудзецца, калі беларусы-літвіны, жывучы на ўласнай зямлі, будуць прасіць ва ўрада дазволіць ім беларускія “садкі, класы, школы” і… адзін універсітэт. Нават у лукашэнкаўскай канстытуцыі запісана, што **ў РБ дзяржаўнымі зьяўляюцца “беларуская** і руская мовы”. Гэта дазваляе нават пры цяперскім рэжыме патрабаваць, каб у Беларусі на нашай мове працавала, **мінімум, палова ўніверсітэтаў!** Усё іншае – беларускія садкі, класы, школы – тады значна лягчэй будзе адкрываць…

6. На жаль, таксама ў “Статэгіі” нічога не сказана пра **Беларускую аўтакефальную хрысьціянскую царкву**… А яна аб’ектыўна мусіць быць дамінуючай на нашай зямлі.

7. Добра было б, калі б у “Стратэгіі” ня толькі было запісана, што яна павінна трапіць у кожную беларускую сям’ю, а і названы тыя, хто будзе арганізоўваць выкананьне гэтага пажаданьня і возьме адказнасьць за яго выкананьне…

8. Галоўнае ж, што ў нас выклікае пярэчаньне, заключаецца ў наступным…

З аднаго боку ў “Стратэгіі” заяўляецца: ***“Сярод шэрагу мадэляў будаўніцтва дзяржавы … выбар мадэлі этнанацыянальнай дзяржавы ў найбольшай ступені адпавядае рэальнай сітуацыі ў Беларусі. Будаўніцтва цывільнай нацыі без належнага грунту этнакультурнай еднасці, падмацаванай агульнай гісторыяй, традыцыямі, мовай, светапоглядамі і, так ці іначай, этнічным паходжаннем, – з’яўляецца памылковым шляхам. Нішто ў сучасных умовах не можа так спрыяць будаўніцтву дзяржавы як прыналежнасць большасці грамадзян да аднаго этнасу”.*** Зь іншага боку,

***“роўныя правы для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў”*** уведзены нават у мэту “Стратэгіі”. Такім чынам, у наяўнасьці ўнутраная супярэчнасьць.

Але праблема ня толькі ў гэтай супярэчнасьці, а яшчэ, мінімум, у дзьвюх рэчах.

Спадарове, па-першае, у цяперашняй лукашэнкаўскай РБ у заключнай стадыі інфармацыйнай версіі генацыду – **у стане татальнага шматгадовага этнацыду** – знаходзіцца наш карэнны нацыяўтваральны этнас. Беларусы-літвіны — старажытнейшы аўтахтонны народ, які тысячагоддзямі мірна жыў выключна на сваёй зямлі, які столькі ўсяго перажыў і столькі стварыў для агульналюдскай цывілізацыі… І раптам гэты народ апынуўся на краі бездані, за якім — сьмерць! Мы, жывучы на ўласнай зямлі, вось-вось можам быць сьцёртыя з твару Зямлі!… Гэта ключавая праблема, пры наяўнасьці якой **кожны сьвядомы беларус павінен увесь час думаць пра яе** і ўсе наяўныя рэсурсы (усе!) накіроўваць на яе вырашэньне. Тым больш, што ні перад палякамі, ні перад рускімі, ні перад габрэямі, ні перад украінцамі, прадстаўнікамі шматлікіх іншых народаў, якія таксама жывуць на нашай зямлі, падобная праблема і блізка не стаіць! У іх ёсьць свае значна больш уладкаваныя, пасьпяховыя ў нацыянальна-культурным, эканамічным, экалагічным, грамадска-палітычным асьпектах нацыянальныя дзяржавы.

Па-другое, у гэты вырашальны і адначасна трагічны час у наш адрас з боку прадстаўнікоў іншых народаў не чутно практычна ніводнага слова падтрымкі-спачуваньня. Пра справы мы і ўвогуле ня кажам… Больш за тое, мы часта назіраем нешта супрацьлеглае. Так, адзначаючы ў 2010 годзе 600-годдзе Грунвальдскай бітвы, прэзідэнты Польшчы і Летувы забылі нават узгадаць ключавую ролю ў ёй нашых продкаў; Польшча і Расея, якія толькі ў XX стагоддзі двойчы “дзялілі” Беларусь паміж сабой, у нашы дні робяць наступнае: з Расеі на нас наступае “русскій мір”, а з Польшчы ня меншая бяда — “карта паляка”; беларусы Смаленшчыны ды Браншчыны па-ранейшаму падвяргаюцца такому ж этнацыду, як і беларусы Беласточчыны; габрэі, якія 600 гадоў карысталіся гасьціннасьцю беларускага народу – мірным жыцьцём на нашай зямлі (перад гэтым зьведаўшы шмат разоў пагромы ды татальныя выгнаньні з боку іншых еўрапейскіх народаў), дасёньня так і не наважыліся паўдзячыць нам — дапамагчы беларусам пазбавіцца ад этнацыднай прамаскоўскай дыктатуры. Хаця маглі б… (дарэчы, калі ацаніць гасьцяваньне габрэяў на нашай зямлі па самым мізэрным кошце (усяго толькі ў 100 мільёнаў даляраў за год) і выразіць гэты кошт у золаце па яго сёньняшнім курсе (40 $ за 1 гр. – 40.000.000 $ за 1 тону), атрымаецца, што габрэйскі народ вінны беларускаму народу 600х100.000.000 / 40х1000.000 = **1500 тон золата**!) Гэтыя факты можна было б працягваць прыводзіць, але пакуль спынімся…

З улікам адзначанага, мы бачым у сфармуляванай мэце “Стратэгіі” прыкметы нейкага **крывадушнага мазахізму**, які не адпавядае аб’ектыўнай рэчаіснасьці і

чамусьці зноў апынаецца павернутым супраць законных правоў ды інтарэсаў беларускага народу… Таму давайце вызваляцца **ад гэтай формы комплекса нацыянальнай непаўнавартасьці**, штучна накінутага нам злачынцамі, недабразычліўцамі. Давайце нарэшце пачынаць усур'ёз клапаціцца пра сябе – спачатку пра сябе (тым больш у такіх трагічных абставінах), **а потым** пра іншых. Ніхто ня супраць ніякіх мірных меншасьцяў! Але клопат пра іх давайце перанясем на той час, калі нашаму народу хаця б сьмерць перастане пагражаць!

У сувязі з адзначаным, прапануем запісаць так: "**МЭТАЙ** Стратэгіі на бліжэйшыя дзесяцігоддзі з'яўляецца **пабудова нейтральнай, нацыянальна-дэмакратычнай, беларускай, сьвецкай дзяржавы, у якой** на перыяд выпраўленьня гістарычнай несправядлівасьці некалькі апошніх стагоддзяў што да карэннага этнасу (т.б., на час нацыянальнай рэгенерацыі), прадстаўнікі нацыяўтваральнага этнасу – беларусы-літвіны, а таксама **іх культура, мова, гістарычная памяць, сімвалы, аўтакефальная царква, сьветагляд, эканамічныя і палітычныя правы, генафонд, іншыя аб'ектыўныя нацыянальныя каштоўнасьці стануць прыярытэтным клопатам** для ўсіх грамадзян Беларусі, а найперш для дзяржаўных уладаў".

З усёй павагай, рэдакцыя "Нашай зямлі".
26 красавіка 2016

**Summary of Discussion "The Nation Building and Modernity - 2015"** *(continuation).*
**Updated version of "Strategy of Belarusian Nation Development" (on June 25, 2016).**
*(magazine "CULTURE, NATION", June 2016, issue 14, pp.22-33)*

The project "The Strategy of Belarusian Nation Development" was published in our magazine on February 6, 2016. Now we provide the updated version of "Strategy" including comments and suggestions presented by web-site "Our Land" ("Nasha zjamlja").

*Юбілеі, даты*

**Пётра Мурзёнак: 135 год з дня нараджэньня Івана Луцкевіча, аднаго з заснавальнікаў беларускай дзяржавы**

Наш часопіс прытрымліваецца правіла ў кожным нумары адзначаць значныя даты з беларускай гісторыі, і ў першую чаргу ўгодкі дня нараджэньня выбітных беларускіх дзеячаў.

Сёлета, зазірнуўшы ў календар на чэрвень, можна было пабачыць шмат знаных імёнаў, вартых упамінаньня на сторанках часопіса:

- 120 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Пётр Татарыновіч (1896–1978), святар, грамадска-культурны дзеяч, літаратар, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Італіі і Ватыкане.
- 120 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Браніслаў Туронак (1896–1938), культурна-грамадскі дзеяч, публіцыст.

Рэдакцыя не магла не спыніцца ў чэрвені на сп. Івану Іванавічу Луцкевічу, 135 год з нараджэньня якога споўнілася 9 чэрвеня.

*(9 чэрвеня 1881 – 20 жніўня 1919)*

Іван Луцкевіч нарадзіўся 9 чэрвеня 1881 г. у м. Шаўляй, Ковенскай губерні, Расійскай імперыі. У 1890 г. пачаў вучыцца ў Лібаўскай гімназіі, далей вучобу працягваў у Мінскай гімназіі (1897-1902). Іван Луцкевіч артымаў выдатную адукацыю – скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, Маскоўскі археалагічны інстытут, працягваў вучобу ў Венскім універсітэце (1904-

1905). Вызначыцца з жыцьцёвым пакліканьнем у юнацтве І. Луцкевічу дапамагла сустрэча з вядомым археолагам Генрыхам Татурам, а таксама знаёмства з беларускім пісьменьнікам і мастаком Карусём Каганцом (Казімірам Кастравіцкім).

Для таго каб пісаць пра такіх яркіх асоб, як Іван Луцкевіч, трэба было б перавярнуць шмат крыніц, каб у поўнай меры паказаць значнасьць яго дзейнасьці на карысьць беларускай нацыі, якую ён здзяйсьняў на пачатку ХХ-га стагоддзя. Біяграфічныя зьвесткі аб ім, а таксама аб яго палітычнай і культуралагічнай дзейнасьці можна адносна лёгка знайсьці ў сеціве. У гэтым сэнсе можна параіць зьвярнуцца ў першую чаргу да грунтоўнага эсэ С. Дубаўца ў “Дзеяслове”, прысвечанае 100-годдзю “Нашай Нівы” (2013), дзейнасьць якой немагчыма ўявіць без братоў Івана і Антона Луцкевічаў. Ёсьць шмат іншых публікацый прысьвечаных дзейнасьці сп. І. Луцкевіча (напрыклад, артыкул Я. Шчаблоўскага “Чалавек, які стварыў Беларусь”, 2010).

Пісаць пра І. Луцкевіча не проста, бо ў сваёй спадчыне ён пакінуў няшмат напісанага, магчыма лічыў, што больш вартым з’уляецца практычная дзейнасьць. Але гэта самае першае тлумачэньне. Як пісаў Максім Гарэцкі: “Хацелася іногды схапіць крандаш і запісваць за ім, каб ды не згубілася, бо сам Іван Луцкевіч работу свайго пяра ўсё адкладаў на пазьнейшы, вальнейшы ад чорнае працы час – усё адкладаў і забраў ад нас сваё знацьцё з сабою ў труну”. Ёсьць толькі адзін апублікаваны артыкул І. Луцкевіча, прысвечаны татарскай спадчыне, “Кітабу”.

Яго шматгранная дзейнасьць цалкам была прысвечаная станаўленьню беларускай нацыі. Гэта знаходзіць сваё адлюстраваньне ў розных галінах чалавечай дзейнасьці, палітычнай, культуралагічнай, ідэалагічнай. Першая спроба заснаваць беларускую партыю адбылася ў Пецярбургу восеньню 1902 года і належыць Вацлаву Іваноўскаму. Верагодна, Беларуская рэвалюцыйная партыя значна страціла б ці нават не адбылася, калі б не браты Луцкевічы. Разам з Іваноўскім яны стварылі Круг беларускай народнай асьветы і культуры ды наладзілі сувязь з Вільняй. Напрыканцы 1903 года там прайшоў першы з’езд партыі “Беларуская рэвалюцыйная грамада”, якая пазней была перайменавана ў Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ).

У 1903 г. Івану Луцкевічу было ўсяго 22 гады, але ён, разам з братам Антонам, у складзе БСГ змагаліся за правы беларускай мовы, за аўтаномію Беларусі і перадачу зямлі сялянам, супраць царызму. У 1905 годзе ён дзейнічаў у Мінску, дзе быў знаёмы з Пуліхавым і сёстрамі Ізмайловіч, якія зьдзесьнілі замах на губернатара Мінскай губерні Курлова (пасьля замаху Луцкевічы вымушаны былі пераехаць у Вільню). У Вільні ён дзейнічаў пад псеўданімам Іван Міхальчук.

У Вільні, можна знайсьці шматлікія праявы дзейнасьці І. Луцкевіча. Ён быў ініцыятарам стварэньня:

- газеты «Наша доля» і «Наша ніва», выдавецтва «Наша хата» (1908),
- Беларускага выдавецкага таварыства (1913),
- Беларускага народнага камітэта (1915—1918),
- першых беларускіх школ на Віленшчыне, Гродзеншчыне, Беласточчыне (1916),
- настаўніцкіх курсаў, Віленскай беларускай гімназіі (1919),
- Беларускага навуковага таварыства (1918),
- Беларускага клуба (1916-1920), вакол якога гуртавалася аматарская драматычная дружына пад кіраўніцтвам Францішка Аляхновіча.

Іван Луцкевіч адказваў за фінансаванне многіх актыўнасьцей адраджэнскага руху. Іван Луцкевіч быў маторам беларускага адраджэньня. Без яго ўдзелу не адбывалася ніводнага значнага мерапрыемства – сапраўды, ён быў чалавекам, які закладаў падмурак беларускай дзяржавы.

*"Проста дзівішся, як успомніш, як гэты чалавек, заараны штодзённай грамадскай працай, знаходзіў час і спосабы здабывання грошай на ўсю беларускую справу,* — успамінала яго нарачоная Юльяна Менке**.** — *Ён кідаўся на ўсе бакі, пры гэтым ніколі не дбаў пра свае асабістыя патрэбы: што здабыў, тое ішло ў грамадскі кацёл".*

Яго асабістая калекцыя стала асновай Беларускага музея ў Вільні. Максім Багдановіч, пабачыўшы калекцыю, адзначыў: «Гэта аснова нашага адраджэньня, якая і праз тысячу гадоў будзе сьведчыць аб нас». У бібліятэцы І. Луцкевіча знаходзілася амаль поўная дакументальная гісторыя пачатку XX стагоддзя, а таксама "Мужыцкая праўда" Каліноўскага, першае выданне Статута ВКЛ 1588 года, святая кніга беларускіх мусульман Аль-Кітаб XVI ст., друкаваная Скарынай Біблія 1517 года, пячаткі полацкіх князёў.

Разам з Антонам Луцкевічам, Вацлавам Ластоўскім і інш., Іван Луцкевіч распрацоўваў пытаньні дзяржаўнага самавызначэньня Беларусі — ад канцэпцыі краёвай аўтаноміі і аднаўленьня на канфедэратыўнай аснове дзяржаўнай уніі Беларусі і Літвы (1906—1918, пачынаючы грамадска-палітычную дзейнасць з пазіцый аўтаноміі, браты Луцкевічы паступова прыйшлі да высновы, што Беларусь павінна стаць незалежнай дзяржавай у канфедэрацыі з Літвою), да абвяшчэньня 25 сакавіка 1918 года незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Паводле яго ініцыятывы і з асабістым яго ўдзелам пытаньне аб нацыянальным самавызначэньні беларускага народа ўпершыню прагучала на міжнародных форумах — канферэнцыі сацыялістычных і рэвалюцыйных партый (Фінляндыя, 1905), Славянскім з'ездзе прагрэсіўных студэнтаў (Прага, 1908), Міжнароднай канферэнцыі нацый (Лазана, 1916). Іван Луцкевіч быў прыхільнікам раўнапраўных адносін Беларусі з Расіяй, Польшчай, Украінай, Літвой.

І. Луцкевіч лічыў дэнацыяналізуючай у адносінах да беларусаў ролю рэлігійна-царкоўных праваслаўных і каталіцкіх структур на Беларусі як праваднікоў інтарэсаў Расіі і Польшчы. Яго думкі аб ролі рэлігіі ў развіцьці беларускай нацыі ў значнай ступені адпавядаюць пазіцыі часопіса «Культура, Нацыя» ў наш час. Іван Луцкевіч выступаў за аднаўленне на Беларусі царкоўнай уніі дзеля паяднаньня рэлігійнага і грамадска-палітычнага рухаў у адзіным нацыянальна-адраджэнскім працэсе.

Іван Луцкевіч цяжка хварэў на сухоты. Каханая Юліяна Мэнке ў сярэдзіне чэрвеня 1919 г. змагла завезьці яго на курорт у польскае Закапанэ, але было ўжо позна. Там ён памёр. Прах Івана Луцкевіча, прывезены з Польшчы ў 1991 г. і перазахаваны на віленскіх могілках Росы.

Несумненна, што імя Івана Луцкевіча яшчэ будзе прыстойна адзначана ў будучай Беларусі.

**On the 135th Anniversary of Ivan Lutskevich**

*(Abstract, magazine "CULTURE, NATION", June 2016, issue 14, p. 34-37)*

Editorial Board of the magazine "CULTURE, NATION" commemorates the 135-th day of birth of Ivan Lutskevich, the prominent Belarusian activist, one of the foundators of Belarusian nation.

*Наступны нумар часопіса «КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ» выйдзе ў верасьні 2016 года*